# АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛАХ I, II

**1. Сучасная палітычная карта свету і палітычная геаграфія.**
**2. Геаграфія насельніцтва свету.**

***Праверым свае веды.***

1. Міжнародны канфлікт — гэта…
2. Геаканфлікталогія — гэта…
3. Палітыка-геаграфічнае становішча — гэта…
4. Геапалітыка — гэта…
5. Электаральная геаграфія — гэта…
6. Дэмаграфічнае старэнне — гэта…
7. Узнаўленне насельніцтва — гэта…
8. Мегасіці — гэта…
9. Мегалаполіс — гэта…
10. Міграцыйны пераход — гэта…
11. Якія змены адбыліся на палітычнай карце свету ў XX–XXI стст.?
12. Якая роля ААН у забеспячэнні міру?
13. Назавіце міжнародныя канфлікты, якія адбываюцца ў цяперашні час. Вызначце прычыны гэтых канфліктаў.
14. Якую ролю займае геапалітыка ў сістэме геаграфічных навук?
15. Якія фактары аказваюць уплыў на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне?
16. Чаму на палітычнай карце свету з'яўляюцца самаабвешчаныя дзяржавы? Прывядзіце прыклады.
17. Чаму многія краіны прэтэндуюць на тэрыторыі ў Антарктыцы?
18. Чаму насельніцтва нераўнамерна размяшчаецца па тэрыторыі Зямлі?
19. Чаму існуюць адрозненні ва ўзроўні ўрбанізацыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца?
20. Чаму для міграцыйных працэсаў характэрная хвалепадобнасць?

***Папрацуем з атласам.***

1. Пакажыце на карце пяць залежных тэрыторый. Якім дзяржавам яны належаць?
2. Пакажыце на карце пяць найбуйнейшых дзяржаў свету і назавіце іх сталіцы.
3. Пакажыце на карце краіну з максімальнай нараджальнасцю, назавіце яе сталіцу; краіну з мінімальнай нараджальнасцю і яе сталіцу.
4. Пакажыце на карце краіну з максімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце і яе сталіцу; краіну з мінімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце і яе сталіцу.

5. Назавіце і пакажыце краіну з найбольшай доляй насельніцтва «дзіцячых узростаў» у полаўзроставай структуры.

6. Назавіце і пакажыце краіну з найбольшай доляй насельніцтва ва ўзросце 60+.

7. Пакажыце на карце краіны з прагрэсіўным тыпам узроставай структуры насельніцтва.

8. Пакажыце на карце краіны са стацыянарным тыпам узроставай структуры насельніцтва.

9. Пакажыце на карце краіны з рэгрэсіўным тыпам узроставай структуры насельніцтва.

10. Пакажыце на карце асноўныя калідоры міграцыі.

11. Пакажыце на карце краіны паходжання найбольшай колькасці бежанцаў у свеце.

12. Пакажыце на карце краіну з максімальнай шчыльнасцю насельніцтва, назавіце яе сталіцу; краіну з мінімальнай шчыльнасцю насельніцтва і яе сталіцу.

13. Пакажыце на карце краіну з максімальнай доляй гарадскога насельніцтва, назавіце яе сталіцу; краіну з мінімальнай доляй гарадскога насельніцтва і яе сталіцу.

14. Назавіце і пакажыце тры найбуйнейшыя агламерацыі свету.

15. Назавіце і пакажыце найбуйнейшыя мегалаполісы свету.

***Прагназуем.***

1. Якія новыя напрамкі ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі могуць з’явіцца ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі?

2. Якія праблемы, на ваш погляд, могуць абвастрыцца ў сувязі з ростам або скарачэннем колькасці насельніцтва Зямлі?

3. Як зменяцца суадносіны гарадскіх і сельскіх жыхароў у бліжэйшыя 50 гадоў?

4. Якія могуць быць варыянты вырашэння праблемы бежанства ў свеце?